

КЛІМАВІЦКАЯ ІНФА-ПАНАРАМА

№16(132)

15 кастрычніка 2014 Клімавіцкі грамадска-палітычны бюлетэнь

СУД КЛІМАВІЦКАГА РАЁНА РАЗГЛЯДАЕ ПАЗОЎ СУПРАЦЬ УЧАСТКОВАГА

У судзе Клімавіцкага раёна 10 кастрычніка прайшло чарговае судовае пасяджэнне, паведаміў праваабаронча сайт spring96.org. Згодна з гэтым паведамленнем, у судзе працягваецца разгледацца пазоў жыхаркі вёскі Дамамерычы Клімавіцкага раёна Алены Марчанкі аб абароне гонару, годнасці і дзелавой рэпутацыі.

Нагадаем, што ў сваім пазове Алена Марчанка звярнулася да суда Клімавіцкага раёна з просьбай прызнаць не адпавядаючымі рэчаіснасці і ганьбячымі яе гонар і годнасць звесткі, якія былі агалошаны 8 студзеня 2014 г. на пасяджэнні адміністрацыйнай камісіі Клімавіцкага райвыканкама. Маецца на ўвазе характарыстыка, якую напісаў участковы інспектар В.С. Панасенка.

У прыватнасці, Алена Марчанка лічыць не адпавядаючымі рэчаіснасці наступныя сцвярджэнні ўчастковага: тое, што яна па характару запальчывая, схільная да ілжы і паклёпу, не падтрымлівае адносінаў з суседзямі, адмоўна характарызуецца па месцу жыхарства і што на пастаўленыя па сутнасці заўвагі яна не рэагуе.

Грамадзянка Марчанка выказала нязгоду з гэтым сцвярджэннем супрацоўніка міліцыі і ў якасці доказу прывяла той факт, што яна ні разу не прыцягвалася да адміністрацыйнай, грамадзянскай ці дысцыплінарнай адказнасці за распаўсюд ілжывай альбо паклёпніцкай інфармацыі.

Таксама спадарыня Марчанка спасылаецца на папярэднюю характарыстыку таго ж участковага, у якой ён характарызаваў яе як спакойнага, ураўнаважанага чалавека, які не ўчыняе скандалаў па месцы жыхарства, характарызуецца здавальняюча і да адміністрацыйнай адказнасці не прыцягвалася.

Па словах магілёўскага праваабаронцы Барыса Бухеля, гэта ўжо другое судовае пасяджэнне, на якім разглядаецца пазоў Алены Марчанкі. На першым - 30 верасня - жыхарка вёскі Дамамерычы папрасіла запрасіць у суд шэраг сведкаў з ліку сваіх аднавяскоўцаў. Гэта было патрэбна для таго, каб яны маглі распавесці, ці сапраўды яна па характару запальчывая, схільная да ілжы і паклёпу, не падтрымлівае адносінаў з суседзямі і г. д., як напісаў у характарыстыцы на жанчыну ўчастковы Панасенка.

Падчас судовага пасяджэння 10 кастрычніка сведкі з боку Алены Марчанкі зняпраўдзілі характарыстыку і адзначылі, што Марчанка падтрымлівае добрыя адносіны з сваімі аднавяскоўцамі, ні з кім з іх ні ў якія сваркі не ўступае.

Спадарыня Марчанка просіць суд абавязаць адказчыка абвергнуць звесткі, ганьбячыя яе, шляхам прадастаўлення характарыстыкі, якая адпавядае рэчаіснасці. У пазове ў суд Алена Марчанка патрабуе агалошвання гэтай характарыстыкі на бліжэйшым планавым пасяджэнні адміністрацыйнай камісіі Клімавіцкага райвыканкама ў яе прысутнасці. Разам з тым яна чакае публічнага прынясення ўчастковым інспектарам выбачэнняў. Таксама Алена Марчанка звяртаецца да суда з просьбай спагнаць з адказчыка ўплачаную ёй дзяржпошліну ў памеры 450 тыс. рублёў.



Раней спадарыня Марчанка звярталася ў Клімавіцкі РАУС, УУС Магілёўскага аблвыканкама і прасіла прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці па артыкулу 9.2 КаАП (паклёп) участковага інспектара. Але станоўчага выніку папярэднія звароты ў РАУС і УУС не прынеслі.

Праваабаронца Барыс Бухель, які прысутнічае на пасяджэннях у Клімавічах, кажа, што суд Клімавіцкага раёна можа вынесці канчатковае рашэнне 16 кастрычніка. Менавіта на гэту дату было прызначана наступнае судовае пасяджэнне.



ЧАСТНЫЕ ИНТЕРЕСЫ НЕ ПРОТИВОРЕЧАТ ОБЩЕСТВЕННОЙ ВЫГОДЕ

Александр ВЛАД



На прошлой неделе было объявлено о проведении сессии Климовичского районного Совета депутатов. 25 сентября народные избранники собрались рассмотреть следующий вопрос: «О ходе выполнения Программы государственной поддержки малого и среднего предпринимательства Климовичского района на 2013-2015 годы». Интересно, пригласили ли на это заседание самих предпринимателей? Думается, что они бы не отказались узнать у депутатов, что делается для поддержки и развития предпринимательства на Климовщине.

На сессии было заявлено обсуждение результатов по реализации Программы, принятой районным Советом депутатов весной 2013 г. «Программа государственной поддержки малого и среднего предпринимательства Климовичского района на 2013–2015 годы» действует достаточно давно, так что пора подводить некоторые итоги.

К сожалению, фактической информации на эту тему немного. Можно только в самом общем виде представить ход выполнения основных пунктов данной Программы. Так, пункт 6 извещает, что «выполнение мероприятий и реализация задач Программы позволит обеспечить достижение следующих прогнозных показателей: количество микро-, малых и средних организаций в 2013 году планируется на уровне 68 единиц, в 2014 году – 69 единиц, в 2015 году – 72 единиц; численность занятых в сфере малого и среднего предпринимательства (включая численность индивидуальных предпринимателей и привлекаемых ими наемных лиц) составит в 2013 году 960 человек, в 2014 году – 980 человек, в 2015 году – 1 тысячу человек».

По состоянию на 1 января 2014 года число индивидуальных предпринимателей в Климовичах составило 540 человек («Родная ніва» - 15.03.14). На середину текущего года — 557. Также совсем недавно районка проинформировала, что сейчас на территории района осуществляют свою деятельность 62 организации малого предпринимательства, где занято 397 наёмных работников («Родная ніва» - 27.09.14). Таким образом, отдельные цифры обнародованы. Но было бы правильнее, чтобы климовчане смогли получить полную и всестороннюю картину развития частного сектора в регионе.

Сделать это необходимо хотя бы по той причине, что наш город получает от предпринимателей весомые финансовые поступления в бюджет. Вот, скажем, что сообщила в прошлом году районная газета: в Климовичском районе за 9 месяцев 2013 года «частный бизнес отчислил в районный бюджет 8,9 млрд. руб. Для примера, отчисления ликеро-водочного завода составили 6,3 млрд. рублей» («Родная ніва» - 19.10.2013).

Подтверждает значимый вклад частного бизнеса в благосостояние Климовщины и Отчёт Климовичского райисполкома об итогах работы за 2013 год. Из него можно узнать, что субъектами малого бизнеса было произведено свыше 12% продукции промышленного производства, осуществлено свыше 40% розничного товарооборота, выполнено 27% объёма строительно-монтажных работ.

Так что на сентябрьской сессии депутаты обсуждали важный во всех отношениях вопрос. Почему бы слугам народа не сделать это обсуждение достоянием широкой общественности?

БЕЗЛОШАДНАЯ БЕЛАРУСЬ

Данила МЕСТИЧ


В белорусской деревне легче встретить иномарку, чем коня. Лошади перевелись не только у частников, но и в коллективных хозяйствах. Трудно поверить, но на весь Хотимский район несколько лет назад числилось всего 140 лошадей, в Чериковском — 156. Не намного лучше ситуация в Климовичском районе, где когда-то, до прихода к власти Лукашенко, держали целые табуны. В 1993 году в племзаводе «Тимоново» было 152 лошади, племсовхозе «Высоковский» — 135, экспериментальной базе «Роднянская» — 125. Но всё сошло на нет и сегодня осталось только официально признать почти полное исчезновение коневодства в Беларуси.



ШКОЛЬНЫЙ МАТРИАРХАТ

Елена ПОЛЯКОВА

Главное статистическое управление Могилёвской области подготовило подборку фактической информации ко Дню Учителя. Среди прочего, можно узнать, что сегодня на Могилёвщине учителями школ преимущественно работают женщины.



По сведениям Главного статистического управления, в прошлом учебном году доля женщин в общей численности учителей составила 85,6%. Ещё более поразительно то, что мужчин почти не осталось и среди руководящих педагогических кадров. Сегодня в школах среди директоров и их заместителей женщины составляют 82%.

Данные статистики можно подкрепить на примере школ города Климовичи. Директора-мужчины остались только в трёх учебных заведениях. Это Средняя школа №1 (Шур Михаил Робертович), Средняя школа №3 (Шупранов Владимир Иванович), районная гимназия (Зенькович Андрей Дмитриевич). А на селе и вовсе всего в двух школах — в Гусарке (Витун Степан Михайлович) и Лобже (Пролыгин Михаил Петрович).

Напрашивается закономерный вывод, что современная белорусская школа — это матриархат во всех его проявлениях. А ведь психологи и социальные педагоги постоянно говорят, что мальчики нуждаются в мужском воспитании, без чего невозможно сформировать полноценную личность будущего мужчины.

НОВОСТИ РЕГИОНА

ЧТО ЖДЁТ ЛВЗ И ЦЕМЗАВОД?

Правительственный план по развитию экономики на 2014-2015 годы предусматривает лишение неэффективно работающих предприятий государственного финансирования. Если это случится, то больше всех могут пострадать жители небольших городов, где на одном крупном предприятии трудится большинство населения. Сейчас в Беларуси 41 градообразующее предприятие в 40 малых городах и посёлках. В Климовичах такую роль выполняет ЛВЗ, в Кричеве — цемзавод. Когда ухудшится положение этих предприятий, то уровень жизни в Кричеве и Климовичах снизится ещё больше. Кстати, уже сейчас на каждом втором градообразующем предприятии зарплата ниже, чем в среднем по стране.

ОТМЕЧЕН ПРОЕКТ

Более 100 музейных учреждений приняли участие во II национальном форуме «Музеи Беларуси» в Гомеле. На форуме были отмечены достижения учреждений Могилёвской области, сообщает еженедельник «Могилёвская правда». Дипломами за реализацию культурно-образовательных проектов награждены Костюковичский краеведческий музей, Дрибинский историко-этнографический музей и музей областного лицея № 5 Быхова. Также посетителями форума были отмечены выставочные проекты других музеев, в том числе Климовичского районного краеведческого музея.

ДОЛГОЕ ЭХО ВОЙНЫ

Этой осенью на улице Ленина в Климовичах местные жители нашли опасную находку. По информации УВД облисполкома, при проведении земляных работ они обнаружили артиллерийский снаряд времён войны. Была вызвана милиция, которая срочно эвакуировала население из близлежащих домов. Также была перекрыта дорога, а транспорт направляли в объезд. Приехавшая сапёрно-пиротехническая группа обезвредила взрывоопасную находку.

БУККРОССИНГ В КЛИМОВИЧАХ


Буккроссинг как общественная инициатива (англ. bookcrossing - дословно «переход книги») нацелен на то, чтобы книги приносили удовольствие от чтения как можно большему количеству людей. Практически это свободный и неограниченный обмен книгами, переход литературы от одного читателя к любому другому. Центральная районная библиотека города Климовичи, а также библиотека аграрного колледжа организовали для своих посетителей такую возможность. Можно приносить личные книги и менять их на книги остальных участников буккроссинга.

НИВА, СТЕПЬ И ПОЛЕ

Выпуск изделий под новой торговой маркой начнёт Климовичский ликеро-водочный завод, сообщил в конце августа портал mogilevnews.by. Новая торговая марка «Каласы» представлена тремя видами напитков «Белорусская нива», «Казахская степь» и «Русское поле». Специалисты ЛВЗ выполнили для них специальный дизайн упаковки. Ожидается, что в продажу напитки поступят в сентябре 2014 года.

ПО МИЛЛИОНУ ЕВРО НА 1000 СВИНЕЙ


Свинокомплекс на 24 тысячи голов собирается построить Климовичский комбинат хлебопродуктов. Информационное агентство «Могилёвские ведомости» сообщает, что в настоящее время в рамках проекта уже разработан бизнес-план, а под застройку выделен земельный участок. Объём инвестиций в реализацию данного проекта — 24 млн. евро. Ожидается, что новый свинокомплекс обеспечит климовчанам не менее 30 рабочих мест.



ПОЛИГОН ДЛЯ ПСЕВДОРЕФОРМАТОРОВ

Артём СЕМЁНОВ

Думается, многие наши читатели помнят, как в период с 2005-го по 2010 год по Беларуси вообще и по Могилёвской области в частности прокатилась целая волна укрупнения и объединения сельскохозяйственных предприятий. Основная идея таких преобразований, исходя из заявлений официальной пропаганды, была направлена на повышение эффективности функционирования АПК в целом. Пришло самое время задаться вопросом, помогло ли это решить хотя бы часть многочисленных проблем белорусского сельского хозяйства?



Низкорентабельные или убыточные предприятия присоединяли к хорошо работающим, а потом в статистических отчётах показывали, что убыточных предприятий нет, или их число сократилось. Игра цифрами на некоторое время позволила чиновникам красиво отчитываться о проделанной работе по росту эффективности сельхозпроизводства и снижению числа убыточных хозяйств, но реальную ситуацию на селе это не спасло, а только ухудшило.

Печальней всего то, что можно вспомнить как минимум несколько попыток проведения подобных псевдореформ. Так в 20-30-е годы прошлого столетия на территории нашей республики проводилась коллективизация сельского хозяйства путём создания колхозов. Тогда в каждой деревне было по колхозу, а в некоторых населённых пунктах по два и больше. В послевоенное время процессы укрупнения повторились, например, в деревни стали перевозить хутора и отдельные хозяйства последних уцелевших частников. В 60-е годы появилась теория «бесперспективных» деревень, загубившая сотни и тысячи сельских населённых пунктов. Вплоть до развала СССР колхозы укрупняли путём объединения, включая в их состав по 6-7 деревень.

Нечто подобное демонстрирует нам Краснопольщина последнего десятилетия. До аварии на Чернобыльской АЭС на территории Краснопольского района насчитывалось 8 колхозов и 6 совхозов. Площадь сельскохозяйственных угодий составляла 57928 гектар, пашни — 32469. После Чернобыльской трагедии в распоряжении местных крестьян осталось 29 тысяч гектар сельскохозяйственных угодий и 12,6 тысяч гектар пашни, на которых продолжали работать 5 сельхозпредприятий.

Сегодня можно констатировать, что АПК Краснопольского района уже в наши дни попал в русло вышеназванных процессов. Фактически это был эксперимент по объединению всех убыточных и низкорентабельных организаций АПК района под крылом самого сильного предприятия — СПК «Краснопольский» во главе с крепким хозяйственником В. Бардоновым. По разговорам отдельных осведомлённых лиц, добро на этот эксперимент дали на самом верху президентской вертикали, в чём, откровенно говоря, лично мы сильно сомневаемся. Можем предположить, что сомнительная честь принадлежит местным реформаторам в лице председателя райисполкома А. Ветошкина и его первого заместителя Л. Кондратени. Помнится, что на Краснопольщине тогда поговаривали, что в случае успешных результатов по объединению всех хозяйств в одно, следующим таким районом в Беларуси должен был якобы стать Нарочанский.

И вот с тех пор прошло уже более пяти лет. Это более чем достаточно для того, чтобы сделать обоснованный вывод по итогам вышеназванного эксперимента. И он, скажем прямо, явно неутешительный. В качестве доказательства сказанного приведём две выдержки из главной государственной газеты страны «Советская Белоруссия» за 2012 и 2013 годы.

Статья собственного корреспондента П. Минченко «Плохо отмерили и криво отрезали» («СБ» от 21.02.2012 г.): «Недавно я вновь побывал в Краснопольском районе. Первым делом отправился к директору УКСП «Краснопольский» Василию Бардонову, недавно назначенному на должность. Василий Николаевич огорошил меня прямо с порога: — Эксперимент с треском провалился. Бардонову есть с чем сравнивать. До объединения он возглавлял ещё не укрупнённое сельхозпредприятие «Краснопольский». На тот момент это было самое сильное хозяйство в районе, вокруг которого и стали собирать остальных. Кормами и топливом «Краснопольский» помогал соседям. Покупал новую технику, вкладывал средства в собственное развитие. А что сейчас? На единственном в районе сельхозпредприятии висят все долги влившихся в состав СПК. Сумма впечатляющая — около 70 млрд. рублей…Тут не до жиру: хотя бы с текущими платежами разобраться. Минувшим летом, например, Краснопольский не смог вовремя заплатить за электроэнергию. Сначала энергетики отключили контору, потом машинные дворы, пилорамы, зернотоки. Две недели не было света….».

П. Минченко, статья «Приписки с поля вон» («СБ» от 26.09.2013 г.): «Более 14 тысяч тонн якобы заготовленных кормов «нарисовали» в Краснопольском районе. Тем самым фактически обрекли на голодовку скот…Примечательно, что столь масштабные приписки в Краснопольском районе выявляются уже не первый раз…В 2011-ом приписали 800 гектаров убранных площадей, почти 3,5 тысячи тонн зерна. Кроме того в отчётах «нарисовали» несуществующее поголовье скота. Приписки выявили сотрудники КГК Могилёвской области….».

Почему так произошло, пояснять, в общем-то, не надо. Наши читатели вполне могут сделать самостоятельные выводы по поводу провалившегося эксперимента на Краснопольщине. Более важно задуматься над тем, когда же многострадальный белорусский АПК перестанет быть испытательным полигоном для всякого рода сомнительных псевдореформ.



СЯРГЕЙ АРЖАНЦАЎ — РАТАВАЛЬНІК БЕЛАРУСКІХ КНІГ З КЛІМАВІЧАЎ

У жыхара райцэнтру Клімавічы, што на Магілёўшчыне, Сяргея Аржанцава незвычайнае хобі. Ён ратуе беларускія кніжкі ад знішчэння. Прапануем нашым чытачам нарыс, які падрыхтавала пра клімаўчаніна Радыё Свабода.

Дома ў яго вялікая бібліятэка, там нямала рарытэтных выданняў. Іх Сяргей адшукаў у вясковых і школьных бібліятэках, якія ў раёне ўжо зачынілі.

За плячыма ў Сяргея Аржанцава васямнаццаць гадоў працы ў школьнай бібліятэцы. Як ён кажа, любоў да кнігі ў яго з дзяцінства. Чытаць пачаў значна раней, чым аднагодкі — яшчэ ў дзіцячым садку. За гутаркай згадвае, як выхавацелька садзіла яго з кнігай і садкоўская грамада слухала ягонае чытанне. Цяпер бяз кнігі ня можа сябе ўявіць, прызнаецца Сяргей:

«Не магу прайсці міма, калі бачу, што ад кніг, якія маглі б яшчэ паслужыць людзям, пазбываюцца. Яны ідуць у макулатуру. Калі, напрыклад, закрылі бібліятэку ці знаёмцы пазбываюцца нейкіх кніг, то я найперш вазьму кнігі на беларускай мове. Цяпер цяжка адшукаць кнігі на беларускай мове. Гэта стала сапраўднай рэдкасцю».

Сам Сяргей рускі, але беларускую мову лічыць сваёй улюбёнай. Кажа, што беларуская літаратура ўспрымаецца для яго душой як свая, праз яе ён прыйшоў да разумення і шанавання Беларусі:

«Калі чытаеш, то наталяесься моваю. І калі ў мяне ёсць выбар — якую кнігу ўзяць і прачытаць, то я бяру кнігу па-беларуску», — зазначае Сяргей.

На просьбу назваць найбольш дарагія ў кнігазборы выданні Сяргей ненадоўга задумваецца. «Кожная, — кажа пасля паўзы, — для мяне дарагая». Але ўсё ж называе:

«Вось вялізны том Шэкспіра, выдадзены яшчэ ў пяцідзесятыя гады. У ім п'есы, драматургія па-беларуску. Альбо вось кніга з дарчым надпісам Валянціны Шчадрыной. Яна надпісала яе паэту Бурсаву з Масквы, выхадцу з Клімавічаў. Яна пераклала з беларускай на рускую мову „Дзікае паляванне караля Стаха". Гэта вельмі каштоўная кніга. Сапраўдны рарытэт. У ёй прадмова Васіля Быкава».

Але часцей кніга, кажа Сяргей, рарытэтная не таму, што на ёй нечы аўтограф, а дзякуючы свайму зместу ды таму, што стала рэдкай. Калі трапляюцца такія выданні, то заўжды ловіш сябе на думцы, што мы ня ведаем свайго кніжнага багацця, развівае думку суразмоўца. У невялікім горадзе, як тыя ж Клімавічы, можна шмат цікавых выданняў адшукаць, кажа Сяргей:



«У свой час выдавалася шмат замежных аўтараў у перакладзе на беларускую мову. Выдадзены быў, напрыклад, „Дон Кіхот" Сервантэса. Шмат украінскіх, польскіх аўтараў. Было перакладзена шмат літаратуры для падлеткаў на беларускую мову, каб яны праз яе маглі далучыцца да замежных аўтараў. І „Рабінзон Крузэ" і „Маўглі" — гэта ж было ўсё па-беларуску. Некалькі дзён таму я падарыў дзве кнігі Фенімора Купера на беларускай мове — „Апошні з магікан" і „Зверабой", каб кнігі надалей чыталіся. Калі цяпер кажуць, што няма чаго чытаць па-беларуску, то чаму не перавыдаюць усе гэтыя кнігі?»

Нямала беларускіх кніжак спісваецца з бібліятэчнага фонду беспадстаўна, лічыць Сяргей. Іншым разам тлумачэнне звыклае — іх не чытаюць. Такі падыход, зазначае суразмоўца, недапушчальны:

«Чытачам трэба ўмець давесці, што ёсць добрая літаратура. Не звяртаць увагу на тое, што яна па-беларуску, а звяртаць — на змест. Сярод беларускай літаратуры, якую спісваюць, сустракаюцца кнігі краязнаўчага характару, гістарычныя, пазнавальныя, замены ім проста няма. Наўрад ці іх перавыдадуць».

Шкадуе Сяргей, што не пра ўсе выпадкі закрыцця бібліятэк у раёне ён даведваецца ў час. А бібліятэк, са скрухай адзначае ён, зачыняецца ўсё болей:

«Дзве школы толькі сёлета зачынілі. Вось уявіце, колькі кніг знікла, — кажа ён. — Наўрад ці большая частка з іх захавалася. Усё пайшло ў макулатуру. Лепей, вядома ж, каб жадаючыя разабралі б гэтыя кнігі».

Пытаюся ў Сяргея, як да ягонага захаплення ставяцца знаёмыя. Ці лічаць яго за дзівака? Ён усміхаецца і адказвае, што ёсць такія меркаванні. На іх, аднак, Сяргей надта не зважае. Яго самога здзіўляюць людзі, у якіх няма цікавасці да кнігі, а пагатоў да беларускай:

«Вось у мяне, напрыклад, я ўжо казаў, Шэкспір, Талстой на беларускай мове, дык вось здзіўляюцца: „А які сэнс, — пытаюць, — чытаць іх па-беларуску, калі яны на рускай мове ёсць?". У нашых людзей пакуль яшчэ ёсць непавага да сваёй нацыі. Такая прымітывізацыя мыслення. Праўда, такіх выпадкаў няшмат, хоць яны і ёсць. У асноўным людзі пазітыўна ставяцца да майго захаплення».

Пры ўсіх недахопах цяперашніх бібліятэк Сяргей усё ж лічыць іх надзвычай важнымі ўстановамі. Ён адзначае, што праз іх грамадства можна далучыць да духоўных багаццяў нацыі, прадэманстраваць яму, што ў беларусаў ёсць свая ўласная літаратура, свае нацыянальныя класікі і, вядома, свае беларускія кнігі.

«Мы прыйдзем яшчэ да таго, што беларуская кніга стане прадметам гонару. Яна нікуды ня дзенецца. У Беларусі будуць свае сапраўдныя міністры культуры, для якіх будзе зразумела, што без бібліятэк няма ні культуры, ні культурнай нацыі. Гэта прыйдзе. Так будзе».



ЗНАМЕНИТЫЙ ДИКТОР В КЛИМОВИЧАХ

Михаил ПЕТРОВ

2 октября исполнилось 100 лет со дня рождения Юрия Левитана — знаменитого на весь мир диктора. Его голос знало несколько поколений советских людей. 22 июня он объявил о нападении фашистских войск на Советский Союз, и он же 9 мая зачитал сообщение о безоговорочной капитуляции Германии. К его юбилею вспомним малоизвестный факт — в 1970 году Юрий Левитан приезжал в Климовичи на праздник 25-летия Победы в великой войне.

Об этом рассказал Ефим Златкин, в прошлом журналист климовичской районной газеты, в воспоминаниях «Стоял месяц май…Или моя встреча в белорусской глубинке с Юрием Левитаном». Этот мемуарный очерк разместил сайт израильского литературного журнала «Русское литературное эхо».

Как пишет Ефим Златкин, в мае 1970 года они узнали неожиданную новость: «К нам приезжает…Юрий Левитан, — с последней новостью из райкома партии заскочил в редакцию наш редактор Иван Иванович Журко».

Вот несколько отрывков из воспоминаний: «Всех деталей уже не припомнить. Помню только хорошо, что зал был переполнен. Все хотели увидеть живого, настоящего Левитана. Многие даже не верили, что сейчас, через минуту-две на сцену районного дома культуры выйдет…Юрий Левитан, который приехал сюда прямо из Москвы, которого знает весь мир! Все, конечно, были в напряжении, но особенно ликовали немногие местные евреи. Свет его славы, его громадной известности каким-то образом касался и их всех. Юрий Левитан своим величием, своей известностью будто поднимал, будто возвышал всех этих еврейских тружеников, которые в годы войны воевали, теряли родных и близких, а сейчас нелегким трудом добывали себе хлеб на жизнь. Они даже почувствовали себя какими-то другими…

…Зал затих, а Юрий Левитан, тот самый Левитан – диктор военных лет – скромный, спокойный человек рассказывал о работе на Всесоюзном радио, о том, как попал туда, как нелегко ему было избавиться от своего владимирского "оканья".

Юрий с детства мечтал быть артистом, но приёмная комиссия не приняла его в кинотехникум. Если бы не случайное объявление о наборе в группу радиодикторов, он бы вернулся в родной Владимир. Юрий Левитан зачисляется в группу стажёров радиокомитета. Вначале он разносил по кабинетам различные бумаги и готовил коллегам чай и бутерброды. В конце концов, ему доверили прочесть по радио статью из газеты «Правда». И в эту ночь, когда стажёр Левитан впервые получил доступ к микрофону, у приёмника оказался…-Сталин. На следующий день молодой диктор уже прочёл речь всесильного вождя с доклада на XVII съезде партии. На следующий день 19-летний паренёк стал главным диктором Советского Союза.

И вот этот необычный человек, можно сказать, человек-легенда, приехал к нам.

…Майский вечер ещё дышал очаровательной свежестью, когда мы вышли из помещения. Закат пока не наступил, но золотой солнечный диск уже заходил за горизонт. Я поспешил при дневном освещении сделать несколько фотоснимков Юрия Борисовича. Выбрал минутку, попросил его разрешения навестить его в гостинице.

— Хорошо, завтра утром я буду Вас ждать, - улыбнулся в ответ Юрий Левитан.

…Наутро, в белой рубашке, в галстуке, отдохнувший Юрий Борисович ждал меня в своём гостиничном номере. Я еще раз сфотографировал его, попросил что-то написать для наших читателей. Взяв лист белой бумаги, Юрий Левитан написал нам свои пожелания».

А позже в районной газете «была опубликована фотография Юрия Левитана, было опубликовано письмо к нашим читателям, моя небольшая подтекстовка. И самое важное, что у меня в памяти осталась встреча с этим обаятельным человеком. Думаю, эту память о нём сохранили надолго и все участники той памятной встречи».



В «ПЕНСИОННОМ» РЕЙТИНГЕ БЕЛАРУСЬ НА 64-М МЕСТЕ

Данила МЕСТИЧ



Организация HelpAge International опубликовала ежегодный Глобальный индекс по старению. По данным TUT.BY, были изучены условия жизни людей старше 60 лет в 96 странах. Эксперты проанализировали ряд показателей, в том числе продолжительность жизни, размер пенсий, уровень бедности и т. п. В пятёрку лидеров входят Норвегия, Швеция, Швейцария, Канада и Германия. Беларусь заняла 64-е место в мировом рейтинге качества жизни пожилых людей. Из бывших республик СССР в рейтинг попали Эстония (20-е место), Грузия (28), Латвия (35), Армения (40), Кыргызстан (49), Литва (60), Таджикистан (61), Россия (65), Украина (82).



СТВАРЫЦЬ БЕЛАРУСКАМОЎНУЮ ГРУПУ Ў САДКУ ВЕЛЬМІ ПРОСТА

Міхал КАРНЕВІЧ, Радыё Свабода

У садку № 45 у горадзе Гродна сёлета адкрываецца другая беларускамоўная група з 12 чалавек і ёсць нават рэзервовы спіс ахвотных аддаць сваіх дзетак у гэту групу.

Вольга Валько, маці трохгадовага Стасіка, распавядае, як без лішніх клопатаў можна стварыць беларускамоўную групу для свайго сына, калі ты насамрэч хочаш, каб ён з дзяцінства быў у беларускамоўным асяроддзі.



ТАКІЯ, ЯК МЫ — СВЯДОМЫЯ БЕЛАРУСЫ

* Карэспандэнт: «Спадарыня Вольга, я часта бываю на імпрэзах, дзе збіраецца беларускамоўнае асяроддзе, і большасць людзей, так бы мовіць, ведаю ў твар. Вас сустракаю ўпершыню, але ў вас цудоўная беларуская мова, і дзякуючы вашым высілкам у Гродна ёсць яшчэ адна беларускамоўная група ў садку...»

* Валько: «Ідэя ў нашай сям'і прыйшла, як толькі ў нас Стась нарадзіўся. Мы разумелі: калі гэтага ня зробім для яго мы, то ніхто гэтага ня зробіць. Нам было ў гэтым плане лягчэй, бо дарога была ўжо пракладзена, два гады таму ўжо адчынілі першую беларускамоўную групу. І я не скажу, што ў нас былі нейкія складанасці — галоўнае было знайсці бацькоў, якія пагодзяцца аддаць сваіх дзетак у беларускамоўную групу».

* Карэспандэнт: «І як вы вырашалі гэтую самую складаную праблему?»

* Валько: «Вядома, найперш мы пачалі размовы са сваімі знаёмымі, у каго такія ж дзеткі. Адразу ў „Вячэрнім Гродне“ з'явілася невялікая аб'яўка, якую змясціў аддзел адукацыі. Яшчэ зрабілі самаробную аб'яўку, расклеілі ў розных месцах, змясцілі ў інтэрнэце, і народ пачаў збірацца вельмі хутка. Яны тэлефанавалі мне, а я толькі накіроўвала іх туды, куды трэба было несці заявы».

* Карэспандэнт: «Выходзіць, што ўсё так проста — дастаткова даць аб'яву, і людзі тэлефануюць...».

* Валько: «Трэба сказаць, што ў нас ня ўсе дзеткі з беларускамоўных сямей. Ёсць такія дзеткі, бацькі якіх запісаліся ў нашу групу, паколькі садок у іх побач з домам. А па-другое, група малакамплектная, а гэта вельмі важна для ўсіх мам, таму што болей увагі будзе аддавацца кожнаму дзіцяці. Але мы гэтага нават і не хавалі, а наадварот — выстаўлялі як наш плюс. І ўсё ж большасць сямей у нас такія, як мы — свядомыя беларусы».

«МОВА ЯК БЫ Ў МЯНЕ Ў КРЫВІ»

* Карэспандэнт: «Вы ўжо былі ў садку, бачылі памяшканне, дзе будуць знаходзіцца дзеткі?»

* Валько: «Мала таго, што мы бачылі ўжо памяшканне, мы яго яшчэ робім. Усе бацькі зацікаўленыя, каб іх дзеткам было добра, таму мы там робім сапраўдны рамонт: і сцены, і столь, усё змяняем, магчыма, і мэблю будзем набываць. Мы робім гэта за ўласныя сродкі. Сабралі бацькоўскі сход, абмеркавалі, усе згадзіліся, палічылі, колькі грошай трэба, сабралі іх, нанялі брыгаду, і яны робяць гэты рамонт».

* Карэспандэнт: «А вы ведаеце, хто будзе выхавацелькай у вашых дзетак?»

* Валько: «Канечне. Дарэчы, гэта была адна з умоваў — мы павінны былі, акрамя дзетак, прывесці і сваю выхавацельку. Праўда, нам сказалі, што выхавацельку б знайшлі, але калі мы прывядзём сваю, то ня будуць супраць. Наша выхавацелька пакуль студэнтка, але ва ўнівэрсытэце цяпер дазваляюць студэнтам працаваць па спецыяльнасці на старэйшых курсах. Дзяўчына сама беларускамоўная, хоць вучыцца на англійскай філалогіі, у штодзённым жыцці размаўляе па-беларуску. Яна пагадзілася і з ахвотай сказала, што будзе працаваць. Мы пайшлі разам да загадчыцы, і яе ўзялі на працу».

* Карэспандэнт: «Спадарыня Вольга, тое, што вы распавядаеце, выглядае нават трошкі неверагодна. Бо колькі даводзілася чуць ад людзей пра розныя праблемы ды перашкоды, якія ім чынілі чыноўнікі, каб адкрыць беларускамоўную групу ў садку альбо беларускамоўны клас у школе. Магчыма, вы нешта параіце тым, хто таксама хоча аддаць сваіх дзетак у беларускамоўны садок...».

* Валько: «Я б хацела сказаць, што гэта насамрэч зрабіць вельмі лёгка. Няма ніякіх перашкодаў, галоўнае — самаарганізацыя і жаданне, а яшчэ крышачку інфармацыйнай падтрымкі, каб людзі ведалі. Ніякіх праблемаў я ня бачу і ніякіх перашкодаў, патрэбна ваша жаданне. Мы адусюль атрымлівалі толькі падтрымку: і ў самім садку, і ў аддзеле адукацыі — калі ласка, стварайце. І ўсё, толькі ваша жаданне».

* Карэспандэнт: «Спадарыня Вольга, а які быў ваш шлях да беларускасці?»

* Валько: «Мова як бы ў мяне ў крыві, а па спецыяльнасці я — біёлаг. А да мовы я прыйшла праз каханне. Мой муж беларускамоўным стаў раней за мяне. Ён вучыўся ў Лунінецкім ліцэі, дзе быў вельмі добры асяродак беларускасці. А мы з ім пазнаёміліся ва ўнівэрсітэце, і я ў яго закахалася, а таксама закахалася ў мову. Пазней увесь час задавала сабе пытанне — як жа я раней не магла прыйсці да мовы. Вось такая ў нас гісторыя».



ЕРМАКОВА СПРОГНОЗИРОВАЛА, КАКИМ БУДЕТ СРЕДНИЙ КУРС ДОЛЛАРА В 2015-М

Андрей ВОДЧИЦ, Салідарнасць

Глава Нацбанка Надежда Ермакова на заседании Совета Министров представила проект основных направлений денежно-кредитной политики на 2015 год.

По её словам, инфляцию в следующем году планируется удержать на уровне 12%.

— Это достаточно сложная задача с учётом текущей интенсивности инфляции и планируемого на следующий год увеличения административно регулируемых цен, — отметила Надежда Ермакова, сообщает БЕЛТА.

Глава Нацбанка дала также достаточно оптимистический прогноз относительно курса доллара.

— Предполагается, что среднегодовое значение обменного курса в долларовом эквиваленте составит 11 300 - 11 400 рублей за 1 доллар. Такое изменение стоимости национальной валюты позволит поддержать ценовую конкурентоспособность белорусской продукции, — сказала Надежда Ермакова.

СЁЛЕТА НА МАГІЛЁЎШЧЫНЕ КАНФІСКАВАЛІ 88 САМАГОННЫХ АПАРАТАЎ

А яшчэ 60 тысяч літраў самагоннай брагі, перадае Еўрарадыё. Апошні выпадак быў зафіксаваны 7 кастрычніка ў вёсцы Пушкава Касцюковіцкага раёна. 44-гадовы мужчына вырабляў самагонную брагу з яблыкаў і захоўваў яе ў пласмасавай бочцы ў лазні.

У міліцыі гавораць, што ад пачатку года да адміністрацыйнай адказнасці за выраб самагонкі былі прыцягнуты 1213 грамадзян. Адказнасць за захоўванне болей за 30 літраў брагі складае ад 750 тысяч да 4,5 мільёнаў рублёў з канфіскацыяй спіртаўтрымальнай прадукцыі.

АНЕКДОТ СО СМЫСЛОМ

Муж с женой прожили долгую счастливую жизнь в браке. Они делились друг с другом всеми своими секретами и переживаниями, но только одну вещь жена просила никогда не делать: не заглядывать в старую коробку из-под обуви, которую она держала на верхней полке своего шкафа.

Мужчина никогда и не спрашивал о содержимом коробки. Он просто думал, что это было что-то из личного женского...

Но вот однажды старушка заболела. Когда ей стало совсем плохо, она попросила мужа принести ту коробку к ней в больницу, так как пришло время открыть тайну.

Старик пришел домой, нашёл коробку и открыл её. Внутри были 2 вязаные куклы и огромная кипа денег — 95 тысяч долларов!

— Но... почему? Как?! — он не мог прийти в себя, ошарашенный такой огромной суммой.


— Перед тем, как мы поженились, — сказала старушка удивленному мужу, — моя бабушка поведала мне секрет счастливого брака. Он состоял в том, чтобы я никогда не спорила с мужем. Она посоветовала мне каждый раз, когда я рассержусь на тебя, молча сесть и связать крючком одну куклу.

Старик был тронут — в коробке были всего две куклы. За все 50 лет совместной жизни она всего лишь дважды рассердилась за него. Он обнял жену и поцеловал ее.

— Но откуда же взялись деньги? — недоумевал он.

— А, это? — ответила она с улыбкой. — Это деньги, которые я заработала от продажи кукол.

ЛУКАШЭНКА ПРАПАНУЕ Ў ШКОЛЬНЫХ ПРАГРАМАХ УДЗЯЛЯЦЬ БОЛЬШ УВАГІ ВЫВУЧЭННЮ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ



Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прапануе ў школьных праграмах удзяляць больш увагі вывучэнню беларускай мовы. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў на сустрэчы з членамі Савета Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Паводле слоў Прэзідэнта, цяпер вывучаецца сітуацыя ў сферы сярэдняй адукацыі, дзе таксама хапае недахопаў. У якасці прыкладу Аляксандр Лукашэнка прывёў школьную праграму, у якой рускай і нават англійскай мове адводзіцца больш гадзін, чым беларускай.


«Добра, на рускай мове мы практычна ўсе размаўляем. Але на беларускай мове, скажам шчыра, у побыце, дома мы размаўляем менш. Дык, можа, трэба ў школе на карысць беларускай мовы даць адну гадзіну, а не англійскай?» — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

ІНТЭРНЭТ-БІБЛІЯТЭКА KAMUNIKAT.ORG: КНІГІ, ГАЗЕТЫ, ЧАСОПІСЫ, АЎДЫЁ, ВІДЭА

Праект “Беларуская інтэрнэт-бібліятэка Kamunikat.org”, які рэалізуе Беларускае гістарычнае таварыства, існуе з 2000 году і арыентаваны на збор незалежных беларускіх выданняў. На сайце www.kamunikat.org можна знайсці кнігі, газеты, часопісы, аўдыё і відэа. А ў раздзеле “Перыёдыка” знаходзяцца ўсе нумары “Клімавіцкай Інфа-Панарамы” за 2012, 2013 і 2014 гг.



kamunikat
Беларуская Інтэрнэт–Бібліятэка



КЛІМАВІЦКАЯ ІНФА-ПАНАРАМА

Клімавіцкі грамадска-палітычны бюлетэнь
Адказны за выпуск: Аржанцаў Сяргей Юр'евіч
Адрас: Клімавічы, вул. Леніна, д. 27а, кв.15.
Надрукавана на ўласным абсталяванні. Наклад 299 асобнікаў
Распаўсюджваецца бясплатна